УДК 929.6 (476.6-21) (091)

*Шпунт А.А.*

# ДА ГІСТОРЫІ ГЕРБА ПРУЖАНАЎ

Першыя пісьмовыя звесткі аб Пружанах адносяцца да 1487 году. З XVI ст. Пружаны належалі каралеве Боне, а потым яе дачцэ Ганне. 6 траўня1589 г. па прывілею Жыгімонта Аўгуста горад атрымаў Магдэбурскае права, а разам з ім пячатку, або герб з выявай **"малога звівістага вужа, з пашчы якога выглядае палова дзіцяці"** [1, с. 428]. З прыходам расійскай улады герб ў 1845 г. замянілі на новы, дзе **"в жёлтом поле, изображена ель, и на одной из ветвей ея серебряный охотничий рог"**. Рог и ель указывают, - як тлумачылі геральдысты з С.-Пецярбургу, -- на известный Беловежский лес, который находится вблизи города Пружаны"[2, с. 124].

Прыблізна ў 1997 г., гарадскія ўлады аб'явілі конкурс на лепшы гарадскі герб. Магчыма, яны проста не ведалі пра існаванне "герба з вужом", ці аб тым, што ў 4 пункце "Памятки по вопросам городской и территориальной символики для представителей местных органов власти", сказана:"Неабходна кіравацца такім агульным прынцыпам: чым старажытней герб, тым ён больш ганаровы і прэстыжны для горада, тым багацей закладзены ў ім інфармацыйны і духоўны запал" [3, с. 9]. У выніку, Рашэннем Пружанскага райвыканкама ад 25 сакавіка 1997 г. за № 329 быў зацверджаны праект Геральдмейсцера камісіі па вайсковай сімволіцы і геральдыцы Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь, членкора Усерасійскага геральдычнага таварыства, маёра Леаніда Спаткая. Эталоннае апісанне даволі груваcткае, але ёсць сэнс прывесці яго цалкам, без каментарыяў: **"Серебряный гербовой щит, окаймлённый золотом, разделён лазуревым волнистым вилообразным узким крестом на три поля. В первом диамантовый аист, с червлёными ногами и клювом, в полёте; во втором – лазуревый уж, увенчаный золотою короной, из пасти которого рождается ребёнок (натурального цвета); в третьем – горлач чёрной керамики. Щит увенчан серебряной башенной короной о трёх зубцах (в виде надвратных башен Холмских ворот Брестской крепости) и окружён справа сосновой ветвью и стеблем красного клевера, слева – колосом пшеницы и стеблем льна, перевитый алой лентой, на которой золотыми литерами сделана надпись «Пружаны».** (Решение Пружанского райисполкома от 25.03.1997 № 329 //Бягучы архіў Дзяржаўнай геральдычнай службы). Дзяржаўная геральдычная служба Рэспублікі Беларусь, на плечы якой лягла на той час нялёгкая праца па адраджэнню гарадской геральдыкі, не стала заносіць прадстаўлены праект у Матрыкул, а растлумачыла мясцовым уладам, які герб патрэбны, і 10 кастрычніка 1998 г. Пружанскі райвыканкам вынес новае рашэнне за № 1241 «О воссоздании историческогогерба города Пружаны», дзе 1-м пунктам: "Утвердить в качестве основного символа исторический герб Пружан, полученный городом: 6 мая 1589 года. **«У срэбрным полі блакітны звівісты вуж, увенчаны залатой каронай, з пашчы якога выглядае напаўпраглынутае дзіця"**. ( Решение Пружанского райисполкома от 10.10.1998 № 1214 // Бягучы архіў Дзяржаўнай геральдычнай службы.). У такім выглядзе быў зарэгістраваны Дзяржаўнай геральдычнай службай 12 снежня 1998 г. № рэг. 31.

У выніку праведзеных прац па рэканструкцыі герба Пружанаў 1589 г., былі высветлены факты, дазваляючыя па новаму разглядаць паходжанне дадзенага герба, і якія ў сваю чаргу, абвяргаюць палажэнні, змешчаныя ў выданнях А.К.Цітова, што знаходзілі падтрымку іншых аўтараў, у прыватнасці Л.В.Спаткая ў артыкуле "Герб Пружан. Мифы и факты». («Гербовед». Москва, № 21. 9.1997. СС. 36-45). Звернемся да фактаў. А.К.Цітоў сцвярджае:"Гісторыя мінулага стагоддзя дае наступную каляровую характарыстыку гэтага герба: поле -- срэбнае, вуж – блакітны. Цікава адзначыць, што родавы герб Сфорцаў меў блакітнае поле і срэбнага вужа на ім"[4, с. 72], і недакладна спасылаецца на кнігу Фокс-Дэвіса ". A Complete Guide to Heraldry. (London, 1968. P. 161). (На 161 старонцы можна пачарпнуць шмат цікавай інфармацыі пра выкарыстанне ў геральдыцы фігур трусаў, вавёрак, і г.д.). На старонках жа 193 і 194 ў раздзеле "Рэптыліі" чытаем:"Герб Вісконці, герцагаў Міланскіх, які пазней ужываўся як герб Герцагства Міланскага:"У сярэбраным полі блакітная звівістая змяя, пажыраючая чырвонае дзіця" (у якасці ілюстрацыі прыводзіцца таксама пластычная выява герба рода Вісконці з замка Пассаў XV ст.). Каб канчаткова высветліць пытанне наконт сувязі герба Пружанаў з гербам Сфорца, кіраўніцтва Службы звязалася з дырэктарам Інстытута геральдычных і генеялагічных даследванняў у Нартгейце (Англія), спадаром Сэсілам Р. Хэмфры-Смітам, які ветліва прадаставіў адпаведныя матэрыялы, згодна якім Сфорца мелі сувязь з родам Вісконці, і таксама з'яўляліся герцагамі Міланскімі. Вуж пажыраючы дзіця – агульны элемент гербаў гэтых родаў, мае такое ж апісанне, якое прыводзіць Фокс-Дэвіс. (Ліст дырэктара Інстытута геральдычных і генеялагічных даследванняў у Нартгейце Сэсіла Р. Хэмфры-Сміта Начальніку Дзяржаўнай геральдычнай службы Рэспублікі Беларусь С.Я.Рассадзіну ад 23.05.2000 // Бягучы архіў Дзяржаўнай геральдычнай службы.). Такім чынам, ужыванне адваротнай афарбоўкі, аб якой сцвярджае А.К.Цітоў, што "дазволіла не парушыць адзін з асноўных законаў геральдыкі, які не дапускае існавання двух поўнасцю аднолькавых гербаў"[4, с. 72], -- здаецца, не мае да пружанскага герба ніякага дачынення. Сумнеўна, што Ганна Ягелонка не кіравалась паўсюднай практыкай, а стала б клапаціцца аб захаванні адрозненняў у гербах, у той час, як у Польшчы ствараліся дзясяткі гарадскіх гербаў цалкам ідэнтычных гербам заснавальнікаў/уладальнікаў. "Адрозненні" якія заўважае Л.В.Спаткай, увогуле не з'яўляюцца прынцыповымі. «Ознакомившись с Миланским гербом (коронованной змеёй), -- піша ён, -- становится понятно, почему герб, пожалованный Пружанам Сигизмундом Ваза (корона над щитом) отличается от герба пожалованного Анной Ягеллонкой (коронованный уж): королевские геральдисты не могли допустить появления у Пружан герба, который бы являлся точной копией герба Милана, вот поэтому, корона с головы ужа переместилась на щит»[5, с. 38]. Трэба заўважыць, што дадзеныя факты не мелі ніякіх наступстваў, і ні аб якіх "адрозненнях" тут не прыходзіцца гаварыць. Можна зірнуць на захаваўшыяся гарадскія пячаткі: 1688 г. – вуж у трохпялёсткавай кароне [6, с. 226], XVIII ст. – без кароны [4 с, 71]. У гербах Вісконці і Сфорца, змей то ў кароне, то без яе. Акрамя таго, на розных выявах мы бачым то вушастага змея, то вужа, але гэта таксама, здаецца ў

*Шпунт Андрэй Аркадзьевіч, аспірант Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.*
*Беларусь, 220104, г. Мінск, вул. Жудро, 53 - 50.*

дадзеным выпадку не прынцыпова. Згодна класіфікацыі Фокс-Дэвіса, дзе ён падрабязна разглядае мноства ўсялякіх геральдычных фігур, у раздзеле "Рэптыліі", усе гэтыя пачвары аб'яднаныя ў адзіны комплекс – Serpents (змеі) [7, p. 193 ].

**СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ**

1. Акты, издаваемые комиссиею, высочайше утверждённой для разбора древних актов в Вильне. (АВАК). Т. 5.
2. фон Винклер П.П. Гербы городов, губерний, областей и посадов Российской империи внесённые в Полное собрание законов с 1649 по 1900. С.-Петербург, 1899.
3. Памятка по вопросам городской и территориальной символики для представителей местных органов власти // Комитет по архивам и делопроизводству Республики Беларусь, Государственная геральдическая служба. Минск, 1996.
4. А.К.Цітоў. Геральдыка беларускіх местаў. Мн., 1998.
5. Л.В.Спаткай. Герб Пружан. Мифы и факты//»Гербовед», № 21, 9. 1997, Москва. С. 38.
6. А.К. Цітоў. Пячаткі старажытнай Беларусі. Мн., 1993. С. 226.
7. Fox-Davies A.C. A Complete Guide to Heraldry. London. 1968. P. 193.

УДК 930.2 (476.7)

***Гладышчук А.А.***

# РОД ТАЛОЧКАЎ ГЕРБУ ПОБУГ З РАКАВІЦЫ (БРЭСЦКІ РАЁН)

Колішняя сядзіба Ракавіца, якая знаходзіцца прыкладна ў 15 кіламетрах на поўнач ад Брэста, у пісьмовых крыніцах упершыню ўзгадваецца ў 1524 годзе [1,2]. Актам польскага караля Яна Казіміра [3] ў 1667 годзе гэты маёнтак канфіскуецца разам з вёскамі Ракавіца, Чалеева і Перапекі ў сям'і Старавольскіх за забойства і передаецца новым уладарам Ляшчынскім за вайсковыя заслугі. Але зусім хутка па невядомай нагодзе сядзіба пераходзіць у рукі князёў Шуйскіх, якія валодалі ў той час вёскай Церабунь (месца зліцця ракі Лясной з Заходнім Бугам). У 1738 годзе ўсю маёмасць разам з вёскамі ў князя Ігнація Шуйскага, берасцейскага харунжага, купляе Станіслаў Талочка (нар. у 1700 г.), чэснік жмудскі. З таго часу і да вядомых падзей 1939 года маёнткам валодалі 200 годоў Талочкі. Уладанні ад Станіслава перайшлі да яго сына, Пятра Талочка (1730-1776), стольніка вендзенскага, які параднiў свой род с князямі Шуйскімі, таму што яго жонкай стала княгіня Тэрэса Шуйская. Потым маёнткам правіў іх сын Казімір (нар. у 1775 г.), гарадскі суддзя брэсцкага павету, жанаты на Рэгіне Скірмунт. А ўжо яго сын, Ян Талочка (1819-1903), які ўзяў шлюб з Каралінай з Яскловскіх (1840-1917), маладзейшай за яго на 21 год, надумаў будаваць новую сядзібу ў Чалеева (3 км ад Ракавіцы). Рэалізацыі планаў перашкодзіла вядомае паўстанне за незалежнасць 1863 года, у якім Ян прымаў актыўны ўдзел, разам са сваякамі: бацькам жонкі і яе братам у атрадзе Стасюкевіча, які быў разбіты пад Каралёвым Мастом (сённяшнія Камянюкі). Пасля разгрому паўстання Ян разам з бацькам жонкі ў 1864 годзе апынуўся ў Сібіры, у Табольску, а маёнтак падпадаў пад канфіскацыю. Але яго браты змаглі хутка зарыентавацца і падзяліць маёмасць паміж сабою (да таго часу маёнтак быў цэласны), аддаўшы на канфіскацыю невялікі фальварак Забур'е (сённяшні сельскагаспадарчы комплекс «Заходні»), быццам адзіную ўласнасць Яна Талочкі. Такім чынам Ракавіца адышла да малодшага брата – Юльяна, якой той валодаў да першай сусветнай вайны. Пад час эвакуацыі ў бежанцы ў 1915 годзе Юльян нечакана памірае ў Мінску, і ў 1919 годзе Ракавіца адыходзіць да малодшага сына Яна, Тэадора Талочкі (1876-1946), які застаўся ў гісторыі роду, як апошні гаспадар гэтай фамільнай сядзібы Талочкаў у Ракавіцы. Яго старэйшыя браты на гэты час апынуліся далёка ад родных мясцін і справы мелі зусім іншыя.

Род Талочкаў – старажытны, карыстаецца гербам Побуг (здымак 1), і першыя згадкі аб ім прасочваюцца з полацкіх і літоўскіх летапісаў XIV і XV стагоддзяў [4]. Былі ў гэтым родзе і князі, але заснавальнікам той пратапласты ў Вялікім Княстве Літоўскім, пра якую ідзе гаворка, з'яўляецца Пётр Талочка (1520-1590), падсудак Троцкі, сын якога Ян быў гарадскім суддзёй у Гродне. Ягоны прамы нашчадак Станіслаў Талочка, чэснік жмудскі, у 1738 г. купіў у князя Ігнація Шуйскага маёнтак Ракавіцу з вёскамі, аб чым гаворка ішла вышэй, і дадаў да свайго прозвішча яшчэ адно «л». З таго часу яго нашчадкі мелі прозвішча Tołłoczko, а ў далейшым, калі сталі расійскімі дваранамі, – Толлочко.




***Здымак 1.*** Герб Побуг.

Але звернемся зноў да Яна Талочкі (здымак 2), які ажаніўся з Каралінай з Ясклоўскіх (здымак 3), яшчэ да высылкі яго ў Сібір, дзе ён прабыў 6 гадоў, пачаўшы адбываць пакаранне ў Табольску. Цікава заўважыць, што яго маладая жонка Караліна са сваёй малодшай сястрой адразу пасля высылкі бацькі і мужа ў Сібір, спрабуюць трапіць на аўдыенцыю ў Вільні да расійскага генерал-губернатара Мураўёва (прзва-

***Гладыщук Анатолий Антонович**, к.ф.-м.н., зав. каф. физики Брестского государственного технического университета. Беларусь, БГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*